ад 15 сакавіка 1931 г., больш не разглядалася. У гэты час да яго віны дабавіліся новыя абцяжарваючыя абставіны. З. Жылуновіч абвінавачваецца па справах «Саюза адраджэння Беларусі» (САБ), «Саюза вызвалення Беларусі» (СВБ), «Беларускага нацыянальнага цэнтра» (БНЦ). Галоўнай мэтай гэтых «контррэвалюцыйных фашысцкіх падпольных цэнтраў» было вяртанне БНР шляхам ваеннай інтэрвенцыі. Абвінавачванні былі фальсіфікаваны «паказаннямі» В. Ластоўскага, І. Дварчаніна, Я. Лёсіка, П. Мятлы і інш. У гэты час яны знаходзіліся пад следствам у НКУС, а якімі «метадамі» дабіваліся там «паказанні» зараз вядома. Ні тады, ні пасля прамых доказаў віны З. Х. Жылуновіча не было. Гэта не пашкодзіла старшыні ДПУ БССР Рапапорту заявіць на кастрычніцкім (1936) пленуме ЦК КП(б)Б: «...Мы лічым яго (Жылуновіча — А. Д.) закончаным нацдэмам, на 100 % дапамагаючым ім у працы» [15].

Усіх гэтых абвінавачванняў хапіла, каб 15 лістапада 1936 г. З. Х. Жылуновіч быў арыштаваны НКУС. Не вытрымаўшы здзекаў на допытах, ён памёр 11 красавіка 1937 г. у Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы.

Так сталінская таталітарная сістэма расправілася з адным з самых значных дзеячаў нацыянальнага адраджэння беларускага народа. Больш чым паўстагоддзя мінула са дня смерці З. Х. Жылуновіча, але толькі цяпер усведамляецца намі ва ўсёй глыбіні яго трагічны лёс, з усімі ўзлётамі, памылкамі і сумненнямі.

[1] НАРБ. Ф. 15, воп. 22, спр. 14, арк. 68.
[2] Там жа. Спр. 13, арк. 17.
[3] Там жа. Спр. 10, арк. 53; ф. 15, воп. 3, спр. 1031, арк. 107.
[4] НАРБ. Ф. 4, воп. 3, спр. 31, арк. 300—301; 173.
[5] Майзель Ю., Шапавалаў М. Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б. Мн., 1929. С. 4.
[6] НАРБ. Ф. 15, воп. 3, спр. 1031, арк. 100.
[7] Там жа. Арк. 1.
[8] Там жа. Арк. 2.
[9] Там жа. Арк. 92—99; 107.
[10] Там жа. Воп. 28, спр. 10, арк. 3.
[11] НАРБ. Ф. 4, воп. 21, спр. 220, арк. 116.
[12] Савецкая Беларусь. 1931. 16 красавіка.
[13] НАРБ. Ф. 15, воп. 5, спр. 85, арк. 3; 1.
[14] Там жа. Воп. 28, спр. 10, арк 3.
[15] НАРБ. Ф. 4, воп. 20, спр. 75, арк. 259.

А. І. ХОЦІНА

## ДА ПЫТАННЯ АБ КАНЦЭПЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў 20—30-Я ГАДЫ

Кастрычнік 1917 г. лічыцца пачаткам новага перыяду айчыннай гісторыі, хаця вынікі палітычнага перавароту не адразу адбіліся на культурным жыцці грамадства. Адметнай асаблівасцю гэтага перыяду з'яўляецца ўзмацненне кіруючага ўздзеяння партыі на культурнае будаўніцтва, якое ажыццяўлялася праз сістэму дзяржаўных і грамадскіх устаноў у духу марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Найбольш пільную ўвагу гісторыкаў у гэтым плане прыцягваюць культурныя падзеі 20—30-х гадоў, якія некаторыя даследчыкі супрацьпастаўляюць як часы ліберальнай ленінскай палітыкі і аўтарытарнай сталінскай. Але дастаткова прыгадаць словы Леніна на VIII з'ездзе РСДРП(б) аб тым, што «няма такіх форм навукі і мастацтва, якія б не былі звязаны з вялікімі ідэямі камунізма» [1] (Крупская сфармулявала гэта больш вобразна: «трэба стварыць з мастацтва свайго роду рэзанатар, узмацняючы ўсё камуністычнае» [2]), і ленінскі падзел культур на буржуазную і пралетарскую — фактычнае адмаўленне паняцця «нацыянальная культура» і высоўванне на першы план ідэалагічнага зместу.

Безумоўна, у развіцці савецкай культуры можна выдзеліць дзве тэндэнцыі: творча-дэмакратычную і аўтарытарную. Узніклі яны і праяўляліся адначасова, але галоўную ролю заўжды іграла аўтарытарная тэндэнцыя, якая сілкавалася палітыкай партыі. Выключэннем можна лічыць толькі перыяд з 1921 па 1930 г., калі НЭП як вымушаная ўступка з боку партыі садзейнічала лібералізацыі гаспадарчага жыцця і развіццю культуры на нацыянальнай глебе. Так, у рэзалюцыі X з'езда партыі, напісанай Леніным, чытаем: «Гаспадарчыя ўстановы, установы

ўлады ствараць з мясцовых людзей, якія ведаюць побыт і псіхалогію мясцовага насельніцтва... развіць у сябе друк, школу, тэатр, клубную справу і ў цэлым культурна-асветніцкія ўстановы на роднай мове», а Сталін на гэтым жа з'ездзе фактычна даў дазвол на адраджэнне беларускай культуры: «У мяне ёсць запіска аб тым, што мы, камуністы, быццам бы насаджаем беларускую нацыянальнасць штучна. Гэта няправільна, таму што існуе беларуская нацыянальнасць, у якой ёсць свая мова, іншая, чым руская, дзеля чаго ўзняць культуру беларускага народа можна толькі на яго роднай мове. Год 50 таму ўсе гарады Венгрыі мелі нямецкі характар, зараз яны мад'ярызаваны. Тое ж самае будзе і з Беларуссю, у гарадах якой усё яшчэ пераважаюць небеларусы» [3].

Менавіта таму палітыка нацыянальна-культурнага адраджэння — палітыка беларусізацыі — ў гэтых спрыяльных умовах дала моцны штуршок аднаўленню культуры: стварэнне Інбелкульта, адкрыццё трох нацыянальных тэатраў, усплёск навуковых даследаванняў па ўсебаковаму вывучэнню духоўнай спадчыны Беларусі, яе гісторыі, філасофіі, мастацтва. Але гэта зусім не сведчыць аб тым, што аўтарытарная тэндэнцыя ўвогуле спыняе сваё існаванне. Яна толькі адсунулася на другі план, а партыя працягвала пільна сачыць за развіццём культуры, асабліва літаратуры і тэатральнай справы. Паколькі літаратура і тэатр найбольш масавыя віды мастацтва, яны з'яўляюцца моцнымі сродкамі ідэалагічна накіраванага выхавання. Ці не таму так вітала партыя ўзнікненне «Маладняка» у 1923 г., што саюз лягчэй пільнаваць, дыктаваць яму сваю волю? Маладыя пісьменнікі, магчыма, самі не падазравалі, што сталі праваднікамі аўтарытарызму ў мастацтве.

Усе без выключэння «маладнякоўцы» (як і большая частка дзеячаў культуры разглядаемага перыяду) паходзілі с сацыяльных нізоў — «паэты і пісьменнікі, якія з глухіх куткоў Беларусі ішлі ў лапцях і неслі ў торбачках свае творы» (М. Чарот). Яны ўспрынялі рэвалюцыю як сваё кроўнае, марксізм-ленінізм лічылі вяршыняй дасканаласці і нават не засвоіўшы лепшых дасягненняў сусветнай культуры (адукацыю ва ўсялякіх камвузах мы ў разлік не бяром, бо гэта нават і адукацыяй назваць цяжка), гэтыя «з торбачкамі» шырока размахнуліся: «Мы ўзышлі на беларускіх палях, узараных плугам Кастрычніцкай рэвалюцыі, расцем мы ў час пераходу яе да камунізму. Гэты час характарызуецца сваёй асаблівай культурай — культурай камуністычнага грамадства. Мы — маладняк гэтых новых усходаў і разрастаемся па палях беларускага мастацтва, каб здзейсніць у ім ідэі матэрыялізму, марксізму і ленінізму... даць беларускай літаратуры новы змест, выціскаючы з яе ўсё, што аддае затхласцю мінулага» [4]. Некаторыя з маладнякоўцаў заганарыліся тым, што ствараюць новую культуру, і літаральна рынуліся ў наступ на спадчыну Багушэвіча, Дуніна-Марцынкевіча, не забываючы пры гэтым і паліваць брудам сваіх старэйшых сучаснікаў — Я. Купалу, Я. Коласа, М. Гарэцкага. Іх рэвалюцыйная нецярплівасць, пралетарскасць патрэбны былі новай уладзе, новым канонам і таму амаль да 1930 г. яны мелі падтрымку. Нядзіўна, што ўжо ў 20-я гады набылі шырокае распаўсюджванне рэпрэсіі супраць іншадумцаў, паказальныя суды і публічныя пакаянні — праобраз будучых сталінскіх рэпрэсій.

З дапамогай «д'ябла рынку» партыя паспрабавала пабудаваць сацыялізм чужымі рукамі, але ва ўмовах непрадугледжаных цяжкасцей тут жа «выкінула НЭП да д'ябла», што непазбежна выклікала дэфармацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. Цяпер таталітарнаму партыйнаму кіраўніцтву з яго моцным рэпрэсіўным апаратам творчы патэнцыял народа аказаўся не толькі не патрэбным, але і небяспечным. У галіне культуры ўсё часцей выкарыстоўваюцца забароны, нацыянальнае атаясамліваецца з нацыяналістычным. У канчатковым выніку ворагам сістэмы сталі тыя, хто не хацеў апускаць культуру да ўзроўню развіцця пралетарскіх мас (што фактычна і было зроблена пасля вынішчэння лепшых носьбітаў культуры), а масы ўзняць да вяршынь культуры, г. зн. развіваць культуру не ўшыр, а ўглыб. Такім чынам, прыкладна з 1930 г. у культуры краіны зноў пераважае аўтарытарная тэндэнцыя.

Асэнсаванне гістарычных працэсаў звычайна знаходзіць адлюстраванне ў стварэнні той ці іншай лагічнай схемы грамадскага развіцця, ці яго перыядызацыі. У апошні час ізноў заўважаецца схільнасць расчляняць гісторыю культуры 20—30-х на два перыяды: 20-я гады — адраджэнне і развіццё нацыянальнай культуры і 30-я — палітыка уніфікацыі і заняпаду культуры. Аднак такі падыход не ўлічвае пераемнасці ў развіцці і не дазваляе з дастатковай глыбінёй вызначыць падзеі 30-х. Лагічная схема развіцця культуры ўяўляецца нам трох-, а не двухзвенавай.

Першы перыяд займае храналагічныя рамкі 1920—1927 гг. Пачатак — 2 ліпеня 1920 г., калі загадчык беларускага аддзела Наркамасветы П. Ільючонак

накіраваў Мінскай губернскай тройцы, якая выконвала функцыі ЦК КП(б)Б, запіску, дзе даказваў неабходнасць пераводу школ на беларускую мову навучання і адначасова ўтварэння школ для ўсіх нацменшасцяў рэспублікі. Канец — студзень 1927 г., калі з трыбуны X з'езда КП(б)Б прагучала першае афіцыйнае абвінавачванне ў нацыянал-дэмакратызме. На погляд партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, п'еса Я. Купалы «Тутэйшыя» з'явілася не толькі нацыяналістычнай, але і варожай Савецкай уладзе. У цэлым жа гэты перыяд вельмі дынамічны, насычаны змястоўнымі культурнымі з'явамі, быў сапраўдным Рэнесансам беларускай культуры.

Другі перыяд — 1927—1930 гг.: паступовае згортванне палітыкі беларусізацыі; стварэнне штучных «грунтоўных» абвінавачванняў упартых беларусістаў у варожасці да існуючага ладу. Праўда, партыя і органы ДПУ яшчэ вагаліся: у чым лепш вінаваціць свае ахвяры — у сацыял- ці нацыянал-дэмакратызме? Урэшце, спыніліся на нацыянал- і нават дапамаглі «нацдэмам». Стварылі дзеля іх у 1930 г. міфічныя арганізацыі — «Саюз вызвалення Беларусі» і «Беларускі нацыянальны цэнтр». А ўжо выкалаціць з інтэлігенцыі пацвярджэнне іх існавання — было справай тэхнікі, што і стала зместам трэцяга перыяду. Ён ахоплівае цалкам 30-я гады. Менавіта ў гэты час пачынае фарміравацца уніфікаваная мадэль культуры, якая праіснавала аж да нашых дзён.

У час рэпрэсій 1930—1936 гг. былі выкрэслены з культурнага жыцця амаль усе прыхільнікі Адраджэння. Але ў 1936—1937 гг. аўтарытарнаму кіраўніцтву здалося, што многія адраджэнцы атрымалі ў якасці пакарання да крыўднага мала: высылку, тэрмін якой ужо завяршаўся. Для такіх пачаліся паўторныя арышты і «пасадкі». Вось, напрыклад, што пісаў у лісце да І. Сталіна выдатны беларускі сатырык А. Шашалевіч, аўтар рамана «Запіскі Самсона Самасуя», у якім паказаў тыповага савецкага кіраўніка «з нізоў», з адпаведнай рабочай культурай і кам'адукацыяй (ліст захоўваецца ў архіве Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры): «По окончании срока ссылки, в 1937 г., мне выдали советский паспорт. Я остался работать в леспромхозе, имел самые хорошие отзывы о своей работе от партийных и профсоюзных органов... Но меня без всякой мотивировки арестовали... Два месяца длилось следствие, три раза меня вызывали на допрос. Сущность нового обвинения: А. Вольный, совершенно незнакомый со мной в бытовой и общественной жизни, был арестован и признался, что [он] возглавлял контрреволюционную организацию. В перечислении [членов] этой организации пристегнул и фамилию Шашалевич» [5].

Ва ўмовах усеагульнай падазронасці, цкавання і неабгрунтаваных рэпрэсій некаторыя «працаўнікі пяра» абралі сваім жыццёвым крэдам «а нам старым абы жыць» і спрабавалі насуперак сумленню ліслівa даказваць савецкай уладзе сваю лаяльнасць і нават карыснасць. Пачынаючы з 1930 г. у прэсе ўсё часцей з'яўляюцца «паражаючыя» радкі такіх дзеячоў, накіраваныя супраць нацдэмаў, сваіх учарашніх лепшых сяброў: «Прыйшла на вас суровая расправа, перад судом віну прызнаць прымусім» [6].

Але партулады клапаціліся аб тым, якую форму прымітыўнай культуры навязаць народу, кожны прадстаўнік якога стаў «шрубкай» каманднa-адміністрацыйнай машыны. Выбар паў на «метад сацыялістычнага рэалізму» — прымітыўнае ілюстратарства. Яскравае пацвярджэнне таму — заклік БелАПП да рабочых-ударнікаў ісці ў літаратуру, каб адлюстраваць працоўную барацьбу на прадпрыемствах і складанасць класавай барацьбы ўвогуле. Як бачым, прыналежнасць да перадавікоў, на думку кіраўнікоў БелАПП, з поспехам магла замяніць талент і здольнасці. Але сапраўдныя пісьменнікі не маглі ствараць спрошчаную мадэль культуры, таму іх «знішчалі дазвання», каб не засцілі творцам культуры «ад станка».

У гэты ж змрочны перыяд насуперак таму, што літаратурную ніву запаланілі нізкапробныя творы, з'яўляюцца і высокамастацкія стварэнні, налітыя жыватворнымі сокамі сапраўднай, не шрубковай, народнай творчасці.

[1] VIII съезд РКП(б). Протокол. М., 1959. С. 23.

[2] Крупская Н. К. Вопросы коммунистического воспитания молодежи. М., 1966. С. 14.

[3] X съезд РКП(б). Стенографический отчет. М., 1963. С. 702, 213.

[4] Маладняк. 1929. № 1. С. 2.

[5] Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. Кніга паступленняў № 2489.

[6] Полымя. 1930. № 2. С. 3.